# Біяграфія У.С. Улашчыка



# Уладзімір Сяргеевіч **Улашчык**
(1943-2018)



выдатны беларускі вучоны ў галіне фізічнай
і рэабілітацыйнай медыцыны,
акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі,
лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь

# Этапы прафесійнага шляху-I

- Нарадзіўся 3 лютага 1943 г. у в. Валіцкоўшчына Самохвалавіцкага сельсавета Мінскага раёна
- З залатым медалём скончыў сярэднюю школу № 29 г. Мінска
- З чырвоным дыпломам скончыў лячэбны факультэт Мінскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута (1965)
- 1965-1968 гг. - стажор-даследчык, асістэнт кафедры агульнай хіміі Мінскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута; адначасова вучыцца на вячэрнім аддзяленні хімфака БДУ
- 1968-1977 гг. - малодшы, старшы навуковы супрацоўнік, кіраўнік лабараторыі БелНДІ неўралогіі, нейрахірургіі і фізіятэрапіі

# Этапы прафесійнага шляху-II

- 1977-2005 гг. - загадчык кафедры фізіятэрапіі Беларускага дзяржаўнага інстытута ўдасканалення ўрачоў (цяпер БелМАПА)
- 1983-1986 гг. - намеснік міністра і начальнік IV Галоўнага ўпраўлення Міністэрства аховы здароўя БССР
- 1987-1990 гг. - Міністр аховы здароўя Рэспублікі Беларусь
- 2005-2010 гг. - дырэктар Інстытута фізіялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі
- 2010-2018 гг. - кіраўнік аддзела і галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута фізіялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі





Міністр аховы здароўя В.С. Улашчык і галоўны ўрач
А.В. Талкачоў на адкрыцці Мінскага клінічнага
кансультатыўна-дыягнастычнага цэнтра (вул. Сямашкі, 10)
14 лістапада 1989 г.

# Навуковая кар'ера-I

- першыя крокі ў навуцы ў навуковым студэнцкім гуртку пры кафедры агульнай хіміі (кіраўнік дацэнт В.А. Бандарин); за цыкл даследаванняў фізіка-хімічных уласцівасцяў скуры на Усесаюзным конкурсе студэнцкіх работ удастоены залатога медаля *(1964)*
- кандыдацкая дысертацыя «Іёнафарэтычная пранікальнасць скуры і колькасныя заканамернасці электрафарэзу простых іёнаў праз скуру» *(1968)*
- доктарская дысертацыя «Электрафарэз лекавых рэчываў: эксперыментальна-клінічнае даследаванне» *(1973)*

# Навуковая кар'ера-II

- доктар медыцынскіх навук *(1974)*
- прафесар *(1980)*
- заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь *(1996)*
- член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі *(1989)*
- акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі *(2009)*

# Вынікі навуковай дзейнасці

- Распрацаваў шэраг тэарэтычных палажэнняў фізіятэрапіі
- Удакладніў механізмы і заканамернасці дзеянні на арганізм шэрагу фізічных фактараў (пастаянны ток, ультрагук, мікрахвалі, мінеральныя воды, лячэбныя гразі і інш.)
- Навукова абгрунтаваў канцэпцыю комплекснага выкарыстання фізічных фактараў з прафілактычнымі, лячэбнымі і рэабілітацыйнымі мэтамі
- Распрацаваў агульныя прынцыпы сучаснай фізічнай тэрапіі, прапанаваў новыя фізіятэрапеўтычныя метады і апараты
- Сааўтар адкрыцця «Заканамернасць змены ўласных акустычных ваганняў галаўнога мозгу»

# Асноўныя працы

*Аўтар больш як 600 навуковых прац, у тым ліку 35 манаграфій, кіраўніцтваў і падручнікаў, 80 вынаходак і патэнтаў, 25 фізіятэрапеўтычных апаратаў*

- Улашчык, У. С. Тэорыя і практыка лекавага электрафарэзу / У. С. Улашчык. – Мінск : Беларусь, 1976. – 207 с.
- Улашчык, У. С. Увядзенне ў тэарэтычныя асновы фізічнай тэрапіі / У. С. Улашчык; [Прадм. А. Н. Абросава]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 238 с.
- Улашчык, У. С. Нарысы агульнай фізіятэрапіі / У. С. Улашчык. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 200 с.
- Улашчык, У. С. Агульная фізіятэрапія / У. С. Улашчык, І. В. Лукомскі. – Мінск : Кніжны Дом, 2008. – 512 с.
- Улашчык, У. С. Фізіятэрапія : універсальная медыцынская энцыклапедыя / У. С. Улашчык. – Мінск: Кніжны Дом, 2012. – 638 с.
- Улашчык, У. С. Трансдэрмальнае ўвядзенне лекавых рэчываў і фізічныя фактары : традыцыі і інавацыі / У. С. Улашчык. – Мінск : Беларуская навука, 2017. – 266 с.

# Асноўныя працы
























# Дасягненні і ўзнагароды

- лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі *(1986)*
- старшыня Беларускага навукова-медыцынскага грамадства фізіятэрапеўтаў і курартолагаў, старшыня Рэспубліканскага навукова-метадычнай рады па курорталогіі
- прэзідэнт Беларускай медыка-тэхнічнай асацыяцыі
- старшыня Дзяржаўнага экспертнага савета па ахове здароўя
- член Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь
- член Камісіі пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь па памілаванні
- член рэдкалегіі 5 рэспубліканскіх і 6 замежных часопісаў
- ганаровы доктар медыцыны шэрагу замежных універсітэтаў

# Педагагічная дзейнасць



- падрыхтаваў больш за 5000 лекараў-фізіятэрапеўтаў з Беларусі, краін блізкага і далёкага замежжа
- кіраваў выкананнем 45 кандыдацкіх і 13 доктарскіх дысертацый